## Сімволіка знакамітай Белавежскай пушчы – гэта па сутнасці сімволіка ўсей Беларусі

Зусім нядаўна "Звязда" паведамляла пра тое, што па выніках галасавання ў конкурсе цудаў прыроды, абвешчаным на пачатку гэтага года фондам New7Wonders Foundation, Нацыянальны парк "Белавежская пушча" (у групе Е — лясы, нацыянальныя паркі, запаведнікі) імкліва "рухаецца" наперад. З 36-га месца ў групе Е Белавежская пушча паднялася па стане на канец мая на 6-ю пазіцыю, а праз нейкі час заняла чацвёрты радок па выніках галасавання. З гэтым амаль супала іншая, не менш, а нават больш значная падзея напярэдадні святкавання сёлета 600-гадовага юбілею з даты першай згадкі пра ўвядзенне ў пушчы запаведнага рэжыму: заснаванне афіцыйных геральдычных сімвалаў — вялікага герба, малога герба і сцяга — дзяржаўнай установы "Нацыянальны парк "Белавежская пушча". Пра тое, якая праца папярэднічала іх з'яўленню, увогуле — навошта спатрэбілася надзяляць пушчу такімі геральдычнымі сімваламі — нам сёння раскажуць ужо добра знаёмыя чытачам даўнія госці "Звязды": галоўны спецыяліст аддзела навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыі дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі, кандыдат гістарычных навук Марына Елінская і намеснік начальніка ваеннага інфармацыйнага агенцтва "Ваяр" па рэдакцыйна-выдавецкай дзейнасці і рэкламе, падпалкоўнік, член Міжнароднага саюза дызайнераў Віктар Ляхар. Менавіта гэтыя члены Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца аўтарамі афіцыйных геральдычных сімвалаў ДУ "Нацыянальны парк "Белавежская пушча".

### Зубр — як ідэнтыфікатар тэрыторыі

— Гэтыя сімвалы заклікаavны адлюстроўваць гісторыю Белавежскай пушчы і яе становішча як дзяржаўнага нацыянальнага парку. У аснову афіцыйных геральдычных сімвалаў пакладзены гістарычныя гербы Белавежскай пушчы, якія адносяцца да XIX стагоддзя, — пачынаюць аповед Марына Елінская і Віктар Ляхар. — Названыя гербы ў поўнай меры адлюстроўваюць прыналежнасць пушчы да Расійскай Імперыі, паколькі яна ў той час не толькі геаграфічна знаходзілася на яе тэрыторыі, але і служыла месцам палявання для прадстаўнікоў царскай сям'і. Адзін з такіх гербаў у авальным картушы ўпрыгожваў вежу паляўнічага палаца, узведзенага пры імператары Аляксандры III. У ім галоўнай геральдычнай фігурай, размешчанай правай, найбольш ганаровай часткі шчыта, быў прадстаўлены Дзяржаўны герб Расійскай імперыі — чорны двухгаловы арол. Перавязь упрыгожвалі чатыры галавы льва, запазычаныя з аблямоўкі ў гербе дома Раманавых. У ніжняй частцы царскага герба была выява зубра — негеральдычная фігура, якая, уласна, ідэнтыфікавала запаведнае месца. Існаваў і поўны варыянт гэтага герба. Яго вянчала Вялікая імператарская карона Расійскай Імперыі, ад якой адыходзіла блакітная Андрэеўская стужка. У якасці шчытатрымальнікаў абапал выступалі зубры.

Прыгожа, праўда? Аднак было відавочным, што захаваць сёння цалкам ізаграфію герба Белавежскай пушчы перыяду Расійскай Імперыі, наколькі б унікальным ён ні з'яўляўся, не ўяўлялася магчымым. Прычына была такой жа відавочнай: змяніўся сам статус гэтага прыродна-ландшафтнага, экалагічнага масіву — ён знаходзіўся ўжо пад аховай іншай дзяржавы: суверэннай Рэспублікі Беларусь. Таму пры праектаванні новага герба нашым суразмоўцам належала вырашаць дзве галоўныя задачы: з аднаго боку, як мага дакладней і беражліва перадаць дух геральдычнага сімвала XIX стагоддзя, з іншага — напоўніць яго новым сучасным зместам.

### Сімвал фарпосту свабодных зямель

— У новым сімвале ў верхнім полі шчыта размешчана карона. У гербе дзяржаўнай установы "Нацыянальны парк "Белавежская пушча" выкарыстана княжаская карона цёмна-чырвонага аксаміту з гарнастаевай апушкай, трыма бачнымі дужкамі, упрыгожанымі жамчужынамі, над якімі — дзяржава з крыжом. Кароны такой канфігурацыі выкарыстоўваюцца ў тэрытарыяльнай геральдыцы Беларусі для гарадоў, якія знаходзіліся ва ўладанні князя

Вялікага Княства Літоўскага. Вядома, што ў 1409 годзе ў Камянцы вялікі князь Ягайла праводзіў перамовы з князем Вітаўтам і прымаў паслоў ад папы рымскага Аляксандра V. Увосень таго ж года ў суправаджэнні шматлікай світы ён паляваў у пушчы. З таго часу тэрыторыя, дзе на працягу некалькіх стагоддзяў палявалі першыя асобы дзяржавы, атрымала назву Белавежскай пушчы. Тут праходзіла паляванне і ўнука Ягайлы вялікага князя Аляксандра, і Сігізмунда I Старога, і караля польскага Стэфана Баторыя, і іншых каралёў Рэчы Паспалітай, што адначасова насілі тытул Вялікіх князёў Літоўскіх, — праводзіць экскурс у гісторыю Віктар Аляксандравіч.

— Сваю назву "Белавежская" пушча пазычае ад 30-метровай вартавой вежы, узведзенай паміж 1276 і 1288 гадамі па загадзе валынскага князя Уладзіміра Васільковіча на месцы ўмацаванага пасялення Камянец, што месцілася непадалёк ад знакамітага яснога масіву. Вежа атрымала назву "белай" як сімвал фарпосту свабодных ад варожага засілля, у тым ліку і ад рыцараў Тэўтонскага ордэна, беларускіх зямель, хоць яе сцены першапачаткова былі выкладзены з цэглы чырвонага колеру. Выяву чырвонай вежы можна бачыць на гербе горада Камянца. Менавіта таму ў гербе ў верхняй частцы шчыта карона размешчана ў чырвоным, так званым сценчатым полі, што геральдычна ўяўляе каменную кладку архітэктурнага збудавання, — дадае Марына Міхайлаўна.

У новым гербе захавана чорная перавязь. Яна адлюстроўвае перыяд існавання пушчы з канца XVIII да пачатку XX стагоддзя, калі знаходзілася на тэрыторыі, далучанай да Расійскай Імперыі. Расійскія манархі не толькі палявалі ў запаведніку, але і шмат зрабілі для яго захавання. У гербе пушчы, складзеным расійскімі геральдыстамі, двухгаловы арол трымае ў лапах сярэбраны і залаты паляўнічыя ражкі. Дзве пары такіх ражкоў пераменных колераў, замест ільвіных залатых і сярэбраных галоў, размешчаны ў чорнай перавязі ў сучасным гербе. Упрыгажэннем для іх служаць імператарскія кароны.

У ніжняй часцы герба ў сярэбраным полі адлюстраваны зубр натуральнага колеру, пакінуты без змяненняў з XIX стагоддзя — сімвал не толькі Белавежскай пушчы, але і, мабыць, усёй Беларусі. Зубр з'яўляецца самай буйной парнакапытнай жывёлай, ён знаходзіцца пад аховай дзяржавы і занесены ў Чырвоную кнігу.

Герб вялікі, герб малы

— Паколькі значнасць Белавежскай пушчы сёння цяжка пераацаніць, а правядзенне мерапрыемстваў, звязаных з яе 600-годдзем, мае на ўвазе шырокую і шматпланавую прэзентацыю Нацыянальнага парку, нам уявілася магчымым прадставіць не толькі так званы малы, але і вялікі герб, — распавядаюць далей, дапаўняючы адзін аднаго, нашы госці. — Поўны герб, складзены па ўсіх правілах геральдыкі, уключае ў сябе цэлы шэраг састаўных частак, кожная з якіх выконвае адпаведныя функцыі. Цэнтральным ядром любога герба, бясспрэчна, з'яўляецца шчыт з гербавым адлюстраваннем. Герб часцей за ўсё вянчае карона, аднак сустракаюцца і іншыя геральдычныя выявы — рыцарскія шлемы, пёры, жывёлы, фігуры людзей, караблі. У нашым гербе навершыем служыць крона дуба, аснова і корані якога ўпіраюцца ў падножжа, што прадстаўлена ў выглядзе травяной падсцілкі. Колер лістоў, жалудоў і травы не аднолькава зялёны. Некаторыя з элементаў маюць залацістае адценне, падкрэсліваючы тым самым не свежае, веснавое лісце маладога дрэва, а, наадварот, салідны ўзрост не толькі дуба, але і ўсёй Белавежскай пушчы. У геральдыцы дуб — шматпланавы сімвал. Гэта магутнае дрэва — сімвал магутнасці, трываласці, доўгажыхарства і высакароднасці, а таксама славы. Па абодвух баках шчыт трымаюць дзве буйныя жывёлы, што жывуць у Белавежскай пушчы — высакародны алень і зубр. Зубры, дарэчы, трымалі і царскі шчыт. Што датычыцца сцяга, дык ён па традыцыі з'яўляецца вексілалагічнай трансфармацыяй вялікага герба з выкарыстаннем яго асноўных колераў.

***Сяргей РАСОЛЬКА.***

**Источник:** Звязда.-2009.-13 чэрв.-С.6.